## ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»

**Пачалася падпіска на II квартал 2009 года**

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 10120 | 30360 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 9570 | 28710 |
| 63858 (ведамасны) | 16170 | 48510 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 14740 | 44220 |



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЛЮТАГА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 31 (26389)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


## «БЕЛАРУСКІ ДОМ-2009» ЗДЗІЎЛЯЕ НОВЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ І ЦЭНАМІ

**Гэтымі днямі ў Мінску праходзіць 30-я Міжнародная выстава жылля і будаўніцтва «Беларускі дом-2009».**

Больш за 250 фірмаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі, Італіі, Ізраіля, Індыі дэманструюць наведвальнікам навінкі і ўжо папулярныя ўзоры будаўнічых матэрыялаў, паслуг і абсталявання.

З новых цікавых прапаноў мы б адзначылі эканамічныя электраабагравальнікі беларускай вытворчасці, супастаўляльныя па электраспажыванні са звычайнымі ставатнымі лямпамі напальвання. Такі абагравальнік, дастатковы для ацяплення памяшкання памерам у 20 квадратных метраў, прапануецца па цане каля 500 тысяч беларускіх рублёў. Пэўны інтарэс выклікаюць і элітныя фінскія печы з вулканічнага каменя. Яны напальваюцца да 70 градусаў усяго 14 кілаграмамі дроў і захоўваюць цеплыню ў хаце на працягу 10 гадзін. З мінусаў хіба што кошт — каля 3500 еўра. Праўда, як сцвярджаюць вытворцы, такая печ за 5-7 гадоў здольная акупіць выдаткі на ацяпленне газам або электрычнасцю. Прынамсі, менавіта такі вынік далі выпрабаванні, праведзеныя ў Эстоніі.



Даволі цікавай падалася прапанова беларускіх вытворцаў міжпакаёвых дзвярэй са Жлобіна. Яны прадэманстравалі шыкоўныя таніраваныя дзверы з масіву алешыны, коштам усяго 390 — 420 тысяч рублёў з улікам шклення, дзвярной каробкі і ліштвы. Цана за падобныя дзверы ў канкурэнтаў даходзіць да паўтара мільёна рублёў.

З навінак гэтага года, прадэманстраваных расійскімі фірмамі, мы б адзначылі дахавы матэрыял з пластыку, які тэхнічна нагадвае еўрашыфер Андулін, але на парадак больш эстэтычны і практычны, коштам у 40 тысяч рублёў за квадрат.

З тэндэнцый цэнаўтварэння парадавала патанненне драўніны. Так, вытворцы прафіліраванага бруса ў новым сезоне істотна знізілі цэны. Калі летась за кубаметр бруса прасілі да 500 еўра, то сёлета яго можна набыць за 300-350 еўра.

Таксама ў выставачным павільёне ў другі раз праходзіць спецыялізаваная выстава «Ландшафтны дызайн», якая прапануе да новага сезона цэлы шэраг «зялёных» сюрпрызаў.

Выстава прадоўжыцца да 20 лютага.

(Больш падрабязна тэму будматэрыялаў і будаўніцтва працягнем у адным з наступных нумароў.)

**Дзмітрый ГУШЧЫНСКІ.**

## Перспектывы ўзаемаадносінаў Беларусі і ПАСЕ абмеркаваны ў Мінску

**Перспектывы ўзаемаадносінаў Беларусі і Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы абмеркаваны ў Мінску на сустрэчы міністра замежных спраў Сяргея Мартынава з дэлегацыяй Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ), якую ўзначальвае старшыня Камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Ёран Ліндблад.**

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства пацікавіўся ў старшыні камісіі ўражаннямі ад візіту і праведзеных у беларускай сталіцы сустрэч. Ёран Ліндблад адзначыў, што знаходжанне ў Мінску было цікавым і плённым, праведзеныя абмеркаванні праходзілі ў адкрытай атмасферы.

Як паведаміў пазней журналістам міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў, у час размовы з дэлегацыяй гаварылі аб тых праблемах, «якія існавалі на папярэднім адрэзку адносінаў паміж Беларуссю і ПАСЕ, а таксама аб магчымасцях супрацоўніцтва».

«Мы дамовіліся, што ўзаемадзеянне і абмеркаванне метадаў супрацоўніцтва будзе прадоўжана, перш за ўсё, па парламенцкай лініі. МЗС Беларусі будзе садзейнічаць гэтаму дыялогу», — дадаў міністр.

**БЕЛТА.**

## П. Міклашэвіч спадзяецца на хуткае вяртанне Беларусі статусу спецзапрошанага ў ПАСЕ

**Старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Пётр Міклашэвіч выказаў надзею, што парламент краіны зможа ў бліжэйшы час атрымаць статус спецыяльна запрошанага ў Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы. Аб гэтым ён заявіў у ходзе сустрэчы з дэлегацыяй Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы на чале са старшынёй Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ Ёранам Ліндбладам, паведамілі БЕЛТА ў Канстытуцыйным судзе.**

На думку Пятра Міклашэвіча, вяртанне Беларусі статусу спецыяльна запрошанага будзе садзейнічаць больш эфектыўнай імплементацыі еўрапейскіх дэмакратычных прынцыпаў і стандартаў у нацыянальнае заканадаўства.

Таксама членам дэлегацыі ПАСЕ былі дадзены растлумачэнні па прававых падставах магчымасці адмены пакарання смерцю ў Беларусі і аб'явы мараторыю на выкананне гэтага віду пакарання. Пры гэтым звернута ўвага на тое, што Канстытуцыйны суд 11 сакавіка 2004 года вынес заключэнне па гэтым пытанні, у якім прызнаў неканстытуцыйнымі нормы Крымінальнага кодэкса Беларусі ў частцы адсутнасці ў іх указання на часовы характар пакарання смерцю.

**БЕЛТА.**

## АСАБЛІВАСЦІ МІЁРСКАЙ РЫБАЛКІ



Жыхар Міёраў Васіль ГЕРАСІМАЎ з сябрам Цімкам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Беларусі і Латвіі неабходна больш актыўна наладжваць вытворчую кааперацыю

Аб гэтым паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Латвіі Іварсам Годманісам, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Цяпер паспяхова дзейнічае зборачная вытворчасць аўтамабіляў МАЗ, прычым машыны сертыфікаваны па еўрапейскіх стандартах. У бліжэйшы час Мінскі маторны завод прадставіць рухавік Еўра-4, і Беларусь зможа прапанаваць гэту прадукцыю Еўрасаюзу. Таксама паміж Беларуссю і Латвіяй вядуцца перагаворы аб сумеснай вытворчасці тралейбусаў. «Па выніках нашай сустрэчы мы павінны вырашыць пытанні па даверу плацяжоў у пастаўках тэхнікі не па перадаплаце. Думаю, што ўрад можа ўзяць на сябе такую адказнасць, каб падтрымаць узровень узаемнага гандлю», — сказаў Сяргей Сідорскі. У сваю чаргу прэм'ер-міністр Латвіі Іварс Годманіс адзначыў, што ў супрацоўніцтве дзвюх краін існуюць напрамкі, дзе можна падтрымаць і дапоўніць эканомікі адна адной. «Мы можам прапанаваць эфектыўныя аператыўныя і канкурэнтаздольныя каналы транзіту, перавалкі грузаў праз нашы парты», — канстатаваў ён.

### АВАРЫЯ НА НАФТАПРАВОДЗЕ

Прарыў тэхналагічнага водаправода ў прамысловай зоне Міхалкі ў кіламетры ад Мазырскага НПЗ прывёў да аварыі. Струмень воднапясчанай сумесі пад ціскам пашкодзіў рэзервовы нафтаправод РУП «Гомельтранснафта «Дружба». Выхад нафты склаў каля васьмі кубічных метраў. На месцы аварыі ўсю ноч працавалі 14 адзінак тэхнікі МНС. Тэхналагічны працэс на МНПЗ не быў парушаны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости»

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже имущества, обращенного в доход Республики Беларусь:**

**Лот № 1** – квартира № 25 и квартира № 26 (объединенные в одну квартиру общей площадью 153,5 м кв., жилой площадью 108,1 м кв.), расположенные по адресу: г. Минск, проспект Независимости, д. № 76а в г. Минске. Начальная цена – 561 718 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 56 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Аукцион состоится **06 марта 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **04 марта 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефон для справок: (017)227 48 36.**


**Экслібрыс «Звязды»**

## Дакумент — гэта не толькі факт, але і аргумент

**«Хатынь. Трагедыя і памяць: Дакументы і матэрыялы» — так называецца новая кніга, дзякуючы якой расстаўляюцца ўсе кропкі над «і» адносна хатынскай трагедыі.**





«Звязда» неаднаразова ўзнімала тэму фальсіфікацый і спекуляцый, звязаных з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны і, у прыватнасці, трагедыі Хатыні. Складальнікі зборніка знаёмяць чытача з усімі выяўленымі на сёння дакументамі пра знішчэнне фашысцкімі карнікамі 22 сакавіка 1943 года беларускай вёскі Хатынь і яе жыхароў, а таксама пра ўзвядзенне на месцы трагедыі мемарыяльнага комплексу, якому 5 ліпеня 2009 года споўніцца 40 гадоў.

Зборнік складаецца з дзвюх частак. Першая прысвечана непасрэдна хатынскай трагедыі, другая — гісторыі стварэння ДМК «Хатынь».

Значную дапамогу ў выданні зборніка аказаў прэзідэнт фонду «Гістарычная памяць» А. Дзюкаў (Масква).

Выданне ўключае дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі, Белдзяржархіва навукова-тэхнічнай дакументацыі, іншых, а таксама асабістых архіваў сведкаў трагедыі Хатыні Уладзіміра Яскевіча і Аляксандра Жалабковіча, сваякоў Антона Бараноўскага. Пераважная большасць архіўных дакументаў у навуковы абарот уводзіцца ўпершыню.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**


ISSN 1990 - 763X


**Заробкі**

## Прыватнік без абмежаванняў

**Дзяржаўнае рэгуляванне аплаты працы не з'яўляецца перашкодай для ўвядзення больш высокай тарыфнай стаўкі I разраду для арганізацый з замежнымі інвестыцыямі і арганізацый прыватнай формы ўласнасці. Пра гэта падчас сустрэчы з журналістамі паведаміла першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.**

Як нагадала Марыяна Шчоткіна, цяперашні механізм павышэння тарыфнай стаўкі I разраду абавязковы для дзяржаўных арганізацый і арганізацый з дзяржаўнай доляй у іх маёмасці. Разам з тым для арганізацый з замежнымі інвестыцыямі і арганізацый прыватнай уласнасці ён мае толькі рэкамендацыйны характар. Такія арганізацыі маюць поўнае права вызначаць тарыфную стаўку ў залежнасці ад свайго фінансавага стану. Такім чынам, падкрэсліла першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны, для прыватнага бізнэсу тут няма строгіх рамак.

Дарэчы, адзначылі ў міністэрстве, у снежні летась тарыфную стаўку, ніжэйшую за 77 тыс. рублёў, мелі 8,6 працэнта арганізацый прыватнай формы ўласнасці і 0,6 працэнта арганізацый з замежнымі інвестыцыямі, ад 77 да 215 тыс. рублёў — 62,1 працэнта арганізацый прыватнай формы ўласнасці і 23,2 працэнта арганізацый з замежнымі інвестыцыямі, а тарыфную стаўку больш за 400 тыс. рублёў — 0,7 працэнта арганізацый прыватнай формы ўласнасці і 14,7 працэнта арганізацый з замежнымі інвестыцыямі.

**Сяргей ГРЫБ.**


БЕЛИНВЕСТБАНК

**ОАО «Белинвестбанк» извещает,**
что Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 13.02.2009 зарегистрированы изменения в проспект эмиссии облигаций ОАО «Белинвестбанк» 15 выпуска.

С полной информацией можно ознакомиться на сайте банка

**www.belinvestbank.by**

*Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» УНП 807000028*
*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.*

**18 марта 2009 года**

**Минский районный исполнительный комитет**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже трех земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:**

- в деревне Кайково Михановичского сельисполкома площадью 0,2292 га (кадастровый номер 623684202601000202), **начальная стоимость земельного участка 30 808 330 рублей;**
- в деревне Кайково Михановичского сельисполкома площадью 0,2320 га (кадастровый номер 623684202601000203), **начальная стоимость земельного участка 31 184 700 рублей;**
- в деревне Чуриловичи Михановичского сельисполкома площадью 0,1498 га (кадастровый номер 623684206601000196), **начальная стоимость земельного участка 25 011 000 рублей.**

УНП 600068187.


**Антыкрызісная эканоміка**

## Увага — не толькі буйным

**Сусветны крызіс закрануў экспартнаарыентаваную эканоміку Гомельскай вобласці. Ад 70 да 75 % прадукцыі, якая тут вырабляецца, ідзе на экспарт. Таму, калі партнёры пачалі цярпець ад сусветнага фінансавага крызісу, безумоўна, гэта адбілася і на экспартных узаемаадносінах, кажа старшыня камітэта эканомікі Гомельскага аблвыканкама Эльвіра КАРНІЦКАЯ.**

— У лістападзе-снежні пайшлі неплацяжы з боку Украіны, незапатрабаванасць і неплацяжы з боку Расіі, таму летась у нас не атрымалася дасягнуць тых параметраў, якія былі запланаваныя па экспарце прадукцыі. Пры гэтым станоўчае сальда забяспечана, яно проста не дасягнула тых параметраў, якія нам былі зададзены. Сёння адна з асноўных задач — пашыраць геаграфію паставак. Іншага выйсця ў нас няма.

Сёлета трэба забяспечыць тэмп росту прадукцыі на ўзроўні 112,5 %, па інвестыцыях у асноўны капітал 119 %. Мы імкнёмся быць максімальна падрыхтаванымі да тых працэсаў, якія ідуць у сусветнай эканоміцы, прымаем меры, каб мінімізаваць наступствы, але з-за гэтага год будзе складаным. Асноўныя прыярытэты такія. Рэалізуючы прадукцыю на экспарт, мы зможам вярнуць валютную выручку ў краіну і забяспечыць эканоміку замежнай валютай, неабходнай для бесперабойнага функцыянавання тых галінаў, якія маюць патрэбу ў імпарце тавару або абсталявання. Другі напрамак — інвестыцыі ў асноўны капітал. Летась мы прыцягнулі ў эканоміку вобласці 2,4 трыльёна беларускіх рублёў. Практычна мільярд долараў ЗША. Штогод гэтая лічба павялічваецца, але сёлета акцэнт трэба рабіць на прыцягнутыя звонку крыніцы інвестыцый. Таму наша задача — выпрацаваць прапановы для буйных замежных інвестараў. Сёлета ў маніторынгу знаходзяцца 109 інвестыцыйных праектаў, але гэтага недастаткова. Трэці напрамак: гэта развіццё эканомікі ўнутры краіны за кошт у тым ліку самазанятасці насельніцтва і развіцця малога і сярэдняга бізнэсу.

Асноўны негатыўны ўплыў сусветныя тэндэнцыі зрабілі менавіта на экспартаарыентаваныя прадпрыемствы. Няхай гэта «Цэнтраліт», «Гомсельмаш», Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, няхай гэта невялікая вытворчасць. У нас у Рагачове ёсць два вельмі добрыя, прыватныя, дастаткова буйныя прадпрыемствы — «Рэмеза» і «Рэмком». Яны стабільна працавалі ўсе гэтыя гады. У іх партнёры — Украіна і Расія. Зараз сітуацыя вельмі складаная. У іх пакуль партфеля заказаў практычна няма. Ёсць неплацяжы з таго боку. Таму і стаіць задача: падтрымаць не толькі самыя буйныя прадпрыемствы, але і ўсе прадпрыемствы-вытворцы. Зразумела, што для таго, каб стабільнай была сацыяльная сітуацыя, каб не страціць шмат рабочых месцаў, не скараціць плацяжы ў бюджэт, мы выяўляем для кожнай тэрыторыі горадаўтваральныя, валаўтваральныя, сістэмаўтваральныя прадпрыемствы, якія найбольш уплываюць як на сацыяльную сферу, так і на бюджэт, і асаблівую ўвагу будзем надаваць ім.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Валютная выручка прадпрыемстваў у студзені скарацілася на 33,5 працэнта

**Аб'ём валютнай выручкі беларускіх прадпрыемстваў у студзені 2009 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года скараціўся на 33,5 працэнта і склаў $1,68 млрд. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.**

Выручка ад экспарту тавараў зменшылася на 36,8 працэнта да $1,42 млрд і склала 84,5 працэнта ў аб'ёме валютнай выручкі. На долю выручкі ад экспарту паслуг прыпадае 14,7 працэнта, або $247,8 млн (скарачэнне на 1,5 працэнта), ад унутранага гандлю за валюту — 0,6 працэнта, або каля $10,6 млн (скарачэнне на 60,4 працэнта). Іншыя паступленні склалі $1,2 млн (рост на 16,8 працэнта). Паводле папярэдніх даных Нацбанка, каля 29,4 працэнта ўсёй валютнай выручкі забяспечана за кошт паставак у дзяржавы СНД, у тым ліку 24,7 працэнта — ад экспарту ў Расію.

**БЕЛТА.**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.02.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 820,00 |
| ▲ 1 еўра | 3 559,12 |
| 1 латвійскі лат | 5 022,71 |
| 1 літоўскі літ | 1 028,80 |
| 1 чэшская крона | 120,73 |
| 1 польскі злоты | 724,69 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 77,42 |
| 1 украінская грыўня | 341,82 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 36,4267 |
| 10 UAH | 45,9741 |
| 1000 BYR | 12,9586 |
| EUR | 44,1536 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*


## Сярэдняя зарплата ў прамысловасці была ў снежні 2008 года на 8,8 працэнта вышэйшая, чым у сярэднім па Беларусі

**На прамысловых прадпрыемствах Беларусі сярэдняя заработная плата ў снежні 2008 года склала Br1 млн 88 тыс.**

Найбольш высокая заработная аплата ў снежні мінулага года была на прадпрыемствах нафтаперапрацоўчай прамысловасці — Br1 млн 978 тыс., чорнай металургіі — Br1 млн 838 тыс., хімічнай прамысловасці — Br1 млн 503 тыс.

У будаўнічых арганізацыях у снежні 2008 года сярэдняя зарплата склала Br1 млн 353 тыс.

На прадпрыемствах транспарту сярэдняя снежаньская зарплата дасягнула Br1 млн 114 тыс., у тым ліку аўтамабільнага — Br990 тыс., чыгуначнага — Br1 млн 96 тыс., трубаправоднага — Br1 млн 532 тыс., авіяцыйнага — Br1 млн 578 тыс.

У арганізацыях сельскай гаспадаркі Беларусі сярэдняя заработная плата работнікаў у снежні мінулага года складала Br644 тыс. (на 36 працэнтаў ніжэй, чым у сярэднім па рэспубліцы).

Запазычанасць арганізацый па крэдытах і пазыках на выплату заработнай платы па стане на 1 студзеня 2009 года была Br751,4 млрд, або 22,3 працэнта ад налічанага за месяц фонду заработнай платы.Найбольш высокая ўдзельная вага запазычанасці склалася ў арганізацыях Мінпрама (99,8 працэнта ад налічанага фонду заработнай платы), канцэрнаў «Беллеспаперапрам» (80,2 працэнта) і «Беллегпрам» (75,2 працэнта), а таксама ў арганізацыях Мінбудархітэктуры (37 працэнтаў).

У Беларусі сярэднямесячная заработная плата ў галінах бюджэтнай сферы ў мінулым годзе склала Br719,1 тыс. У снежні зарплата бюджэтнікаў складала Br834,7 тыс., або $380 (паводле прагнозу на канец года — $350). Яна зменшылася ў параўнанні з лістападам 2008 года на 0,5 працэнта (на Br4 тыс.).

У арганізацыях аховы здароўя сярэдняя заработная плата ў снежні мінулага года склалася ў памеры Br848 тыс., у тым ліку ўрачоў — Br1 млн 447 тыс., сярэдняга медыцынскага персаналу — Br821 тыс., малодшага медыцынскага персаналу — Br522 тыс.

Сярэдні заработак ва ўстановах адукацыі рэспублікі ў снежні мінулага года склаў Br724 тыс., у тым ліку настаўнікаў — Br795 тыс., прафесарска-выкладчыцкага складу — Br1 млн 784 тыс.

**БЕЛТА.**

## Беларусь летась гандлявала са 183 краінамі

**Тавары пастаўляліся на рынкі 139 дзяржаў, імпартавалася прадукцыя са 168 краін, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі летась былі Расія (47,2% усяго аб'ёму таваразвароту), Нідэрланды (8,2%), Украіна (6,8%), Германія «5%), Польшча (4,1%), Латвія (3,2%), Кітай (2,8%), Злучанае Каралеўства (2,4%), а таксама Бразілія і Італія.

Пастаўкі беларускіх тавараў у Расію па выніках 2008 года ў параўнанні з 2007 годам узраслі на 19,2% да $10,585 млрд і склалі ў аб'ёме экспарту рэспублікі 32,2%. Экспарт у Нідэрланды павялічыўся на 30% і дасягнуў $5,559 млрд (16,9% у агульным аб'ёме), ва Украіну — на 89,8% да $2,79 млрд (8,5%).

У цэлым Беларусь у 2008 годзе павялічыла аб'ём знешняга гандлю таварамі ў параўнанні з 2007 годам на 36,7% да $72,385 млрд. У тым ліку экспарт узрос на 35,5% і склаў $ 32,902 млрд, імпарт павялічыўся на 37,6% да $39,483 млрд.

**БЕЛТА.**

## Цэны на харчовыя тавары за студзень павялічыліся на 3,3 працэнта

**Цэны на харчовыя тавары ў Беларусі ў студзені 2009 года ў параўнанні са снежнем мінулага года павялічыліся на 3,3 працэнта, а ў параўнанні са студзенем 2008 года — на 18,2 працэнта, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Змяненне цэнаў на харчовыя тавары ў студзені гэтага года ў параўнанні з папярэднім месяцам дало 1,6 працэнта прыросту зводнага індэксу спажывецкіх цэнаў. У студзені больш за ўсё выраслі цэны на свініну (акрамя мяса без касцей), сала, ялавічыну першай катэгорыі, рыбу і морапрадукты — яны адпаведна павялічыліся на 2,6 працэнта, 4,6 працэнта, 5,3 працэнта і 9,3 працэнта. Узраслі таксама цэны на крупы і бабовыя на 2,1 працэнта, сыры — на 2 працэнты, макаронныя вырабы — на 2,3 працэнта. Пшанічная мука падаражэла на 1,3 працэнта, хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 0,5 працэнта. Малако і малочныя прадукты павялічыліся ў цане на 1,4 працэнта, масла — на 1,7 працэнта. Кофе стаў даражэйшы на 9,7 працэнта, чай — на 14,4 працэнта. Бульба падаражэла на 11,4 працэнта, агародніна — на 23,2 працэнта.

Менш за ўсё падаражэў алей, алкагольныя напіткі і кандытарскія вырабы — цэны на іх выраслі адпаведна на 0,8 працэнта, 0,7 працэнта і 1 працэнт. Кансервы з агародніны сталі даражэйшыя на 1,9 працэнта, безалкагольныя напіткі — на 1,3 працэнта. Цэны на мяса птушкі знізіліся на 1,1 працэнта. Не змяніліся цэны на цукар.

**БЕЛТА.**

## Беларусь заваліць Расію таннымі аўтамабілямі...

**«Беларусь збіраецца заваліць расійскі аўтарынак таннымі машынамі, піша «Независимая газета»: у краіне цяпер працуе СП «Юнисон», якое збірае іранскія аўтамабілі Samand, але беларускім партнёрам удалося дамовіцца аб сур'ёзным пашырэнні мадэльнага рада. Калі ўсё пойдзе згодна з планам, то ўжо ў 2010 годзе ў Беларусі будуць збіраць па 60 000 аўтамабіляў».**

І гэта, мяркуюць спецыялісты, будуць не толькі іранскія Samand, але і французскія Peugeot 206, а таксама Renault Logan.

«Беларускі аўтамабільны рынак актыўна развіваецца ў апошнія гады, аднак яго ёмістасці не хапае для таго, каб арганізаваць у краіне паўнавартасную вытворчасць», — заявілі на прадпрыемстве. Таму прынята рашэнне наладзіць у Мінску не проста зборку, а паўнавартасную вытворчасць аўтамабіляў, давёўшы адсотак лакалізацыі да 51 %. А гэта ўжо дазволіць практычна без выплаты пошлін пастаўляць машыны ў Расію. Акрамя таго, мяркуецца, што адначасова з пачаткам масавага выпуску аўтамабіляў беларускія ўлады ўвядуць высокія мытныя пошліны на ўвоз іншамарак па прыкладзе той жа Расіі. Каб абараніць інтарэсы ўласнага аўтапрама.



**Антон ЗАПОЛЬСКІ.**

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў пісьменніка Васіля Ласковіча з 95-годдзем

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіля Ласковіча з 95-годдзем. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

## Прэм'ер-міністр Беларусі ўручыў дзяржузнагароды заслужаным людзям краіны

Асаблівую ўдзячнасць Сяргей Сідорскі выказаў працаўнікам прамысловых арганізацый, чые калектывы пастаянна нарошчваюць аб'ёмы вытворчасці. Сярод узнагароджаных — рабочыя, слесары, токары, мантажнікі, вадзіцелі, электрыкі, будаўнікі, ліцейшыкі. Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны генеральны дырэктар ВРУП «МЗКР» Віктар Бутко, памочнік генеральнага дырэктара Беларускага аўтамабільнага завода Пётр Карповіч, дырэктар ААТ «Брэсцкі камбінат будаўнічых матэрыялаў» Уладзімір Марозаў, дырэктар Гомельскага ліцейнага завода «Цэнтраліт» Міхаіл Сайкоў і іншыя.

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны дырэктар санаторыя «Белая Русь» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алег Невяркевіч, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Анатоль Сабітаў, дырэктар, мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы «Музычная капэла «Санорус» Мінскай вобласці» Аляксей Шут.

**БЕЛТА.**

## Дэлегацыя Еўрасаюза на чале з генсакратаром Савета ЕС Хаўерам Саланам наведае Беларусь

Дэлегацыя Еўрасаюза на чале з вярхоўным прадстаўніком па пытаннях агульнай знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі ЕС, генеральным сакратаром Савета ЕС Хаўерам Саланам 18-19 лютага наведае Беларусь. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе МЗС. Запланаваны перагаворы дэлегацыі ЕС з міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргеем Мартынавым. Асноўнай тэмай сустрэчы будзе бягучы стан і перспектывы супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

# Нашы людзі на таксі... па-ранейшаму ездзяць?

**У Маскве нядаўна прайшла першая антыкрызісная забастоўка: два дні вадзіцелі аднаго з самых буйных таксаматорных паркаў адмаўляліся выходзіць на працу, пратэстуючы супраць імклівага скарачэння сваіх даходаў. Згодна з паведамленнямі расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, канфлікт вырашыўся хутка і проста — завадатараў акцыі проста звольнілі. Аднак праблема засталася: У СУВЯЗІ З КРЫЗІСАМ ПОПЫТ НА ПАСЛУГІ ТАКСІ СКАРАЦІЎСЯ. А якая сітуацыя цяпер у беларускіх перавозчыкаў? Па каментар мы звярнуліся да дырэктара транспартнай асацыяцыі «Сталічнае таксі» Канстанціна КУЗЬМЯНКОВА. У яе ўваходзяць усе 10 перавозчыкаў, што займаюцца такога кшталту перавозкамі ў Мінску.**

— Сёння цяжка сцвярджаць нешта абсалютна адназначна, — сказаў Канстанцін Міхайлавіч. — Нейкія больш дакладныя высновы можна будзе зрабіць па выніках працы за сакавік. Рыхтуючыся даць адказы на вашы пытанні, я спецыяльна пагутарыў з прадстаўнікамі некалькіх перавозчыкаў. Сітуацыя ў іх розная: хтосьці гаворыць, што назірае зараз пэўнае змяншэнне аб'ёмаў перавозак пасажыраў, але ці звязана гэта напрамую з фінансавым крызісам — яшчэ пытанне.

Калі гаварыць пра тарыфы на перавозку пасажыраў, дык пераважная маса перавозчыкаў па Мінску мае іх сёння на ўзроўні 1580 рублёў за кіламетр праезду. Дзве дыспетчарскія службы вызначылі тарыф у памеры 1300 рублёў. Ці звярталіся перавозчыкі ў апошні час у органы цэнаўтварэння з просьбай аб іх магчымым павелічэнні? Як сёння ўвогуле працуюць прадстаўнікі гэтага бізнэсу?

— Прапаноў аб павелічэнні тарыфаў ад перавозчыкаў я пакуль не чуў. Напэўна, спрые сітуацыі, у прыватнасці, тое, што цана на паліва апошнім часам застаецца ранейшай, — адказаў Канстанцін Кузьмянкоў. — Што да цяперашніх умоў... Па-першае, адміністрацыямі раёнаў перавозчыкам даводзяцца пэўныя прагнозныя пакзчыкі па тэмпах росту, скажам, на гэты год — 10—12 працэнтаў, па-другое, многае залежыць ад канкрэтнага перыяду года. Ёсць нават такое паняцце, як сезонныя перавозкі. Скажам, у пачатку года, пасля навагодніх святаў, традыцыйна назіраецца пэўны спад колькасці людзей, што карыстаюцца паслугамі таксі. Летам перавозкі зноў актывізуюцца — да сезона масавых водпускаў, а падчас іх зноў традыцыйна бывае зацішша...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Тры аўтамабілі трапілі ў ДТЗ

25-гадовы непрацуючы жыхар Маладзечна, які знаходзіўся за рулём «Фольксвагена», не змог размінуцца з аўтамабілем «Мазда», і машыны сутыкнуліся. Пасля гэтага «Мазда» выехала на паласу сустрэчнага руху, па якой ехаў аўтамабіль «МАН» са сталічным жыхаром за рулём. У выніку ДТЗ пацярпеў вадзіцель аўтамабіля «МАН» — ён змешчаны ў бальніцу, а двое яго пасажыраў, таксама мінчане, загінулі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Аляксандр ГРЫГАРАЎ:

# «НАКОНТ ЦІХАНА І ДЗЕВЯТОЎСКАГА СКАЖУ ТАК: НАШЫ МЕДЫКІ НЕ МАГЛІ ПАМЫЛІЦЦА»

Беларускім алімпійцам у Ванкуверы-2010 запланавана заваяваць два алімпійскія медалі, на Гульнях-2012 — 25 медалёў. Пра гэта паведаміў міністр спорту і турызму Аляксандр Грыгараў, падводзячы вынікі спартыўнага года-2008. Галоўнымі спартыўнымі падзеямі мінулага года міністр назваў Год здароўя і XXIX летнія Алімпійскія гульні ў Пекіне.

— У цэлым год для нас склаўся ўдала, — падкрэсліў Аляксандр Грыгараў. — Рост паслуг, якія мы аказваем насельніцтву, павялічыўся ў параўнанні з 2007 годам на 129 працэнтаў, гэтым займаецца 800 арганізацый фізкультуры і спорту, іх колькасць летась вырасла на 150. Узмацнілася наша база, палепшылася яе тэхнічнае аснашчэнне». Летась Беларусь наведала 5 мільёнаў 300 тысяч замежных грамадзян. Пакуль вялікую колькасць турыстаў складаюць нашы суседзі з блізкага замежжа — расіяне, украінцы, прыбалты, аднак з кожным годам усё больш еўрапейцаў (італьянцы, туркі, палякі) прыязджаюць у нашу краіну. На 2,5 тысячы за апошні год павялічылася колькасць аграсядзібаў. Лідарам па прыёме турыстаў летась сталі сядзіба «Верас» Зэльвенскага раёна і сядзіба «Прылессе» Мінскага раёна, якія прынялі больш за 2 тысячы турыстаў кожная.

Падводзячы вынікі Алімпійскіх гульняў у Пекіне, Аляксандр Грыгараў назваў іх самымі паспяховымі ў суверэннай гісторыі нашай краіны. Рашэнне МАК аб дыскваліфікацыі беларускіх молатабойцаў Івана Ціхана і Вадзіма Дзевятоўскага міністр назваў «непрыемнай сітуацыяй» і выказаў сваё меркаванне на гэты конт. У прыватнасці, ён паведаміў, што ўсе беларускія атлеты перад адлётам у Пекін здавалі допінг-пробы, і «нашы медыкі не маглі памыліцца». Маглі памыліцца, паводле слоў А. Грыгарава, хіміка-аналітыкі пекінскай лабараторы. І юрысты з Англіі, Аўстрыі і Швейцарыі, якія працуюць з Ціханам і Дзевятоўскім, знайшлі шэраг неадпаведнасцяў ва ўзяцці допінг-проб. «Тры месяцы асабісты трэнер Ціхана Сяргей Літвінаў супрацюляўся, аднак потым усё ж пісьмова пацвердзіў мне, што яго падапечны ніякіх забароненых прэпаратаў не прымаў. Ад асобы трэнера і ўрача тое ж самае магу сказаць і я. Будзем чакаць суда, які і вынесе канчатковы вердыкт», — заявіў А. Грыгараў.

Наконт нядаўнага скандалу з асабістым трэнерам Івана Ціхана Сяргеем Літвінавым, які з'язджае з Беларусі, міністр паведаміў наступнае: «Усё было добра, калі ён прыехаў у Беларусь у 2003 годзе, працаваў з адным Ціханам, атрымліваў добрую зарплату, прэзідэнцкую стыпендыю, атрымаў кватэру ў цэнтры Мінска коштам 300 тысяч долараў. Як толькі яго падапечны спатыкнуўся, ён тут жа пачаў шукаць новае месца, дзе будзе больш спакойна. А трэба быць мужчынам і ісці да канца — гэта мая пазіцыя», — заявіў А. Грыгараў.

У працяг тэмы допінг-скандалаў міністр спорту падкрэсліў, што не верыць у сумленнасць заваявання кітайскімі спартсменамі 100 медалёў, з якіх 51 залаты. «Са мной пагаджаліся многія мае замежныя калегі і спецыялісты, з якімі мы на трыбунах назіралі за спаборніцтвамі. У прыватнасці, возьмем цяжкую атлетыку, вагавую катэгорыю, дзе выступаў наш Рыбакоў. Пасля першай спробы кітайца, які ўзяў «золата», я крыху «пашумеў» за кулісамі, бо спартсмен выканаў практыкаванне з памылкай. Мяне пераканалі, што ў другой спробе ён выправіцца. Так і адбылося. У выніку два сусветныя рэкорды за тры хвіліны. Гэта нерэальна. Сваё меркаванне я выказваў кітайскаму агенцтву «Сінь Хуа», паўтараю яго і зараз. У спорце падыходы да ўсіх краін і спартсменаў павінны быць аднолькавымі. Пакурыў марыхуаны Майкл Фелпс, потым папрасіў прабачэння і справу «замялі», чаму тады не прабачыць нашых Ціхана з Дзевятоўскім? Калі вырашылі змагацца з допінгам «мячом», гэты павінна тычыцца ўсіх», — заявіў А. Грыгараў.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

Тармазі!

# Толькі за суткі на дарогах загінула адзінаццаць чалавек, трое з іх — дзеці

**У аддзеле цацак супермаркету ўбачыла маленькага хлопчыка, які заліваўся слязьмі. Як аказалася, ён загледзеўся на жоўты эскалатар, а калі азірнуўся, то маці ўжо не было побач. Пакуль я суцяшала дзіця, маці знайшлася і шчаслівая сям'я пакінула аддзел.**

А вось гераіні майго матэрыялу, на жаль, не змогуць вярнуць сваіх крывіначак...

Адна з жанчын ехала ў якасці пасажыркі на аўтамабіле «Audi-80» разам са сваёй сям'ёй. У выніку сутыкнення з грузавой аўтамашынай МАЗ побач з вёскай Баяры Бабруйскага раёна яна атрымала цяжкія раненні, а кіроўца легкавога аўтамабіля і трое пасажыраў — галава сям'і, яго 14-гадовая дачка і 7-гадовы сын — загінулі.



— Няшчасця удалося б пазбегнуць, калі б кіроўца іншамаркі не выехаў для абгону на паласу сустрэчнага руху, — адзначыў **галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі міжведамасных узаемадзеянняў і прапаганды бяспекі дарожнага руху УДАІ МУС Беларусі Уладзімір СЦЯПАНАЎ.** — Чым ён думаў? Няўжо не ведаў, што ва ўмовах снегападу аўтамабілем з летняй гумай кіраваць немагчыма (на «Audi-80» былі шыны з летнім тыпам малюнка пратэктара. — **Н.Д.**) і што ён аўтаматычна паставіў пад пытанне ўсеагульную бяспеку на дарозе, як толькі выгнаў машыну з гаража. Дзяржаўтаінспекцыя заклікае ўсіх кіроўцаў, якія не маюць грошай на зімовую гуму, на перыяд снегападаў перасесці на грамадскі транспарт. Але і тым сумленным кіроўцам, якія прыслухаліся да рэкамендацый і «пераабуліся», таксама трэба быць надзвычай уважлівымі. Бо на заснежанай дарозе ніхто не застрахаваны ад заносу. Едзьце на мінімальнай хуткасці і пазбягайце неабгрунтаваных абгонаў.

Яшчэ адна жанчына страціла свайго сына на тэрыторыі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося таксама ў выніку сутыкнення іншамаркі з грузавым аўтамабілем. Памылку дапусціў не толькі кіроўца, які не ўлічыў умоў надвор'я і выехаў на сустрэчную паласу. Папярэдзіць смерць сына магла і сама маці. Калі б 5-гадовы хлопчык быў прышпілены, то вынік, магчыма, быў бы зусім іншы.

— Нават у тым выпадку, калі маці не мае магчымасці набыць спецыяльнае дзіцячае крэсла, то, згодна з правіламі дарожнага руху, яна павінна сама прышпіліцца на заднім сядзенні аўтамашыны, а дзіця ўзяць на рукі, — падкрэсліў Уладзімір Сцяпанаў.

Усе ДТЗ, у якіх загінулі людзі, адбыліся ў выніку выезду на сустрэчную паласу руху на недапушчальнай ва ўмовах снегападу хуткасці. Рэзкія змены надвор'я ні для каго не былі сюрпрызам, бо яшчэ напярэдадні СМІ папярэджвалі, што надвор'е пагоршыцца. Тым не менш, з-за вар'яцтва асобных смельчакоў, якія зламаўшы галаву несліся на летняй гуме, людзі страцілі сваіх блізкіх. Беражыце сябе і сачыце за прагнозам надвор'я.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Кібервыклікі

*У Беларусі пачашчаюцца выпадкі камп'ютарных злачынстваў*

Упершыню сутыкнуцца са злачыннасцю ў інфармацыйнай прасторы праваахоўным органам Беларусі давялося больш як дзесяць гадоў таму. І сёння на гэту праблему не могуць закрываць вочы ні праваахоўныя органы, ні правайдары, ні карыстальнікі. Несуцяшальную дынаміку кіберзлачыннасці прывёў **Ігар ЧАРНЕНКА, начальнік упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС,** на семінары па праблемах папярэджання гвалту ў СМІ і сетцы інтэрнэт. Летась было выяўлена 1614 злачынстваў — істотна больш, чым у 2007 годзе (996 злачынстваў), што ўжо казаць пра 1998 год (толькі чатыры выпадкі)...

Пры гэтым колькасць кіберзлачынстваў расце прапарцыянальна павелічэнню камп'ютарнага парка краіны і колькасці карыстальнікаў, — запэўніў начальнік упраўлення. Паводле прыведзеным ім інфармацыі, у 2000 годзе на 100 сем'яў у Беларусі даводзілася два камп'ютары, а праз сем гадоў — ужо 26. Ёсць і лічбы, якія дазваляюць ацаніць распаўсюджанасць інтэрнэту — сёння ў краіне каля трох мільёнаў карыстальнікаў, паслугі якім прапануюць больш як 38 правайдараў. Ігар Чарненка развеяў міф пра тое, што хакеры, — як правіла, дзеці і падлеткі: у Беларусі пераважная большасць злачынцаў у сферы інфармацыйнай бяспекі — дарослыя людзі, якія часцей за ўсё маюць карыслівыя матывы, а не жаданне прадэманстраваць свой узровень камп'ютарнага майстэрства. Таму нярэдкія і выпадкі вымагання праз інтэрнэт...

Спадар Чарненка падкрэсліў, што заканадаўства Беларусі ў сферы барацьбы з кіберзлачыннасцю патрабуе ўдасканалення і далейшага развіцця. «Неабходна заканадаўча рэгламентаваць парадак узаемадзеяння інтэрнэт-правайдараў з праваахоўнымі органамі, перш за ўсё вызначыць тэрміны і меры забеспячэння захаванасці базы звестак аб трафіку».

Падчас семінару кампетэнтныя асобы праваахоўных органаў, навукоўцы азнаёмілі журналістаў не толькі з юрыдычнымі, але і псіхалагічнымі, сацыялагічнымі аспектамі асвятлення крымінальнай тэматыкі.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## Абзац

■ Хуткая дапамога ў Беларусі летась выязджала 420 разоў па лжывых выкліках, расказала БЕЛТА намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі меддапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Жылевіч. 45 тыс. выклікаў былі бязадраснымі — «хуткую» выклікалі на адрас, якога не існуе.

■ **Супрацоўнікі Гомельскай мытні разам з міліцыянерамі канфіскавалі партыю незадэклараванага тавару на суму Br443 млн. Падчас рэйду быў затрыманы аўтамабіль «Газэль», якім кіраваў грамадзянін Расіі. У салоне знаходзілася 442 бензапілы «Цунамі». Уладальнік грузу ўехаў у Беларусь, мінуючы пункт мытнага афармлення.**

■ Самыя буйныя ў свеце вытворцы і аператары мабільных тэлефонаў дамовіліся аб выпуску ўніверсальнага зараднага прыстасавання ўсіх марак тэлефонаў. Такое рашэнне прынятае на Сусветным мабільным кангрэсе, які праходзіць у Барселоне (Іспанія). Цяпер у 27 краінах Еўрасаюза выкарыстоўваецца больш за 30 відаў зарадных прыстасаванняў. Як мяркуецца, навінка паступіць у продаж да 2012 года.

■ **Кітайскі тэлежурналіст 17 лютага пасля падзення з даху 25-павярховага будынка атрымаў цяжкія траўмы, але застаўся жывы. Рэпарцёр мясцовай тэлестанцыі праводзіў здымкі падчас моцнага ветру. Яго даставілі ў бальніцу ў вельмі цяжкім стане.**

## Поўны абзац

■ **ЗАГС Масквы больш за 6 гадоў адмаўляецца выдаваць пасведчанне аб нараджэнні і зарэгістраваць дзіця, якога бацькі назвалі БОЧ РВФ 260602. Да гэтай пары хлопчык жыве таксама без медыцынскага поліса. Яго імя расшыфроўваецца як Біялагічны Аб'ект Чалавека роду Вароніных-Фраловых, які нарадзіўся 26 чэрвеня 2002 года. Усе спробы чыноўнікаў пераканаць бацькоў прысвоіць дзіцяці больш прывычнае імя ні да чаго не прывялі. Сям'я шукала падтрымкі ў Страсбургскім судзе, але там разглядаць справу адмовіліся. У Галоўным упраўленні ЗАГС Масквы назвалі яшчэ некалькі незвычайных імёнаў дзяцей, якія былі зарэгістраваныя летась, — два хлопчыкі па імені Север, адзін Дэльфін, Вецер і Анёл. Дзяўчатак назвалі Лунай і Галавікторыяй. Раней зарэгістраваныя такія імёны, як Салат Латук, Авіядыспетчар, Проста Герой, Зара-Зараніца, Воля, Віягра, Прахалода і Прыватызацыя. А ў Варонежскай вобласці сёлета ў студзені ЗАГС выдаў пасведчанне аб нараджэнні дзяўчынкі па імені Расія Кіцэнка.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ДВАНАЦЦАЦІПУДОВАГА БЫЧКА

спрабаваў вывезці на прыгарадным цягніку жыхар Хойнікаў 50-гадовага ўзросту, які нідзе не працаваў. А калі дакладней, дык 185 кілаграмаў ялавічыны. А тут — міліцыя, якая і затрымала яго. На пытанне «дзе ўзяў?» мужык доўга не выкручваўся. Прызнаўся, што разам з двума сябрукамі ўкраў мяса з ахоўваемай тэрыторыі мясцовага спажывецкага таварыства.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## «ДАПАМОГА» З УКРАІНЫ

У пас. Мухавец Брэсцкага раёна міліцыя затрымала беспрацоўнага з Украіны, які на «Мерседэсе» перавозіў 2170 кг цяляціны. Дакументаў на мяса, коштам каля 24 млн рублёў, не было і яго канфіскавалі. А ў доме жыхаркі в. Павіцце Кобрынскага раёна знайшлі гарэлку ўкраінскай вытворчасці без акцызных марак Беларусі. Прыхаваная «Хорціца» пацягнула на 10 мільёнаў.

## НЕ ДАЧАКАЛАСЯ

Каб хутчэй трапіць у спісы курсантаў аўташколы і атрымаць вадзіцельскае пасведчанне, жыхарка Баранавічаў заплаціла знаёмаму хлопцу 980 тыс. рублёў. Ён паабяцаў за гэтыя грошы ўладкаваць жанчыну на вучобу. Хлопец грошы ўзяў і знік. Праз месяц даверлівая пайшла скардзіцца ў міліцыю. Маўляў, ні грошай, ні вучобы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# «Забараніць продаж спіртных напояў у дні выдачы авансу і зарплаты»

**З такой прапановай выступіла Упраўленне ўнутраных спраў Мінскай вобласці. Мінаблвыканкам падтрымаў гэту ініцыятыву, нават нягледзячы на тое, што новы метад барацьбы з алкагалізмам істотна адаб'ецца на памеры выручкі ў крамах. Самае галоўнае, каб людзі, атрымаўшы грошы, прынеслі іх дадому, а не прапілі.**

— «Дзень цвярозасці» не будзе прыпадаць на канкрэтную дату месяца, бо ў такім разе людзі не абмінуць набыць спіртное напярэдадні, — адзначыла старшы інспектар Упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі УУС Мінаблвыканкама Марыя ЖОЛАБАВА. — У першую чаргу будзем арыентавацца на буйныя прадпрыемствы, такія, як «Беларуськалій», «БелАЗ». Хутчэй за ўсё, гэта будзе пятніца ці субота, бо на выхадныя дні прыпадае найбольшая колькасць злачынстваў у бытавой сферы, больш за ўсё людзей затрымліваецца супрацоўнікамі міліцыі падчас распіцця алкаголю ў грамадскіх месцах. У Мінску і Мінскай вобласці 14 лютага ўжо прайшоў Дзень цвярозасці. Вынікамі мы задаволеныя: у гэты дзень не зафіксавана ніводнага злачынства ў быце.

**Надзея ДРЫЛА.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ВА УКРАІНЕ ЎВЕСНУ ЗВОЛЬНЯЦЬ ДВА МІЛЬЁНЫ ЧАЛАВЕК

Украіне пагражае новая хваля скарачэнняў, лічаць у Дзяржаўнай службе занятасці. Увесну на рынку працы могуць апынуцца 2 млн супрацоўнікаў, якія пакуль працуюць у рэжыме няпоўнай занятасці. Аналітыкі чакаюць масавых скарачэнняў у прамысловасці, гандлі і сферы паслуг.

## THE TIMES СКЛАЛА СПІС САМЫХ ВЯДОМЫХ ПАЛІТЫКАЎ-П'ЯНІЦ



**Адстаўка міністра фінансаў Японіі Сіоці Накагава, які нядаўна з'явіўся ў п'яным выглядзе на сустрэчы «вялікай сямёркі», ізноў давяла, што алкаголь пагражае палітыкам мноствам бедаў. Аднак гэта не перашкаджае ім любіць спіртное. The Times склала спіс самых вядомых выпівак са свету палітыкі.**

Сваімі п'янымі выхадкамі праславіўся, напрыклад, брытанскі міністр замежных спраў шасцідзясятых гадоў Джордж Браун. Калі верыць слыху, то аднойчы падчас афіцыйнага прыёму ў Перу Браун запрасіў патанчыць нейкую асобу ў фіялетавым. На гэта быў адказ: «Не, па-першае, вы п'яны. Па-другое, гэта не вальс, а нацыянальны гімн Перу. А па-трэцяе, я не жанчына, а архібіскуп Лімы». Пазней міністр у нецвярозым стане накрычаў на прэм'ера і неўзабаве падаў у адстаўку.

У любым выпадку, брытанцу далёка да расійскага прэзідэнта Барыса Ельцына. Расійскі лідар аднойчы быў настолькі п'яны, што не змог выйсці з самалёта падчас візіту ў Ірландыю, у іншы раз спатыкнуўся на сцэне, а неяк — і зусім спрабаваў дырыжаваць ваенным аркестрам.

Уінстан Чэрчыль паводзіў сябе значна больш стрымана, але таксама не цураўся алкаголю. Перад адпраўкай на англа-бурскую вайну ён узяў з сабой 18 бутэлек скотчу, 36 бутэлек віна і 6 бутэлек брэндзі. За ўсю сваю палітычную кар'еру ён не адмаўляўся ад алкаголю, хоць у яго было строгае правіла: ніякага моцнага алкаголю да сняданку. У канцы жыцця ён заўважыў: «Я атрымаў ад алкаголю больш, чым ён ад мяне».

Прыхільнасць да выпіўкі была не самой дрэннай рысай прэзідэнта ЗША Рычарда Ніксана, хоць і прычыняла клопаты супрацоўнікам яго адміністрацыі. Брэнт Скоўкрафт, яго памочнік, успамінае, што ў разгар араба-ізраільскай вайны 1973 года на тэрміновы начны званок п'яны ў вусцілку Ніксан адказаў: «А мы можам ім сказаць «не»?»

Калі ва ўсім свеце ідзе барацьба з п'янымі кіроўцамі, то ў Аўстраліі падумваюць аб праверцы на алкаголь для палітыкаў. Гэтая прапанова не пазбаўлена падстаў: прэм'ер-міністр Кевін Рад у 2007 годзе засвяціўся ў нью-йоркскім стрыптыз-бары, а яго папярэднік Джон Говард прызнаў, што выступаў перад парламентам, выпіўшы «пару бутэлек паўднёвааўстралійскага чырвонага».

Брытанскі прэм'ер пачатку мінулага стагоддзя Герберт Генры Асквіт і зусім меў мянушку «Пад мухай», паколькі выпіваў рэгулярна і на працягу амаль усяго жыцця.

## ДЗЕ Ў СВЕЦЕ ЖЫЦЬ ДОБРА?

**Даследчы Legatum Institute апублікаваў «Рэйтынг глабальнага дабрабыту 2008». Паводле вынікаў гэтага даследавання, лепш за ўсё жыць у Аўстраліі. ЗША занялі шосты радок фінальнай табліцы, Расія — 57-ы.**

Складальнікі рэйтынгу ўлічвалі некалькі фактараў: жыхары той або іншай краіны павінны мець магчымасць вольнага выбару; яе ўрад павінны быць эфектыўным, невялікім і сумленным; для «бедных» краін галоўнай мэтай павінна быць павышэнне дабрабыту, а для «багатых» — паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва; клімат і стан навакольнага асяроддзя ўплываюць на ўзровень шчасця; аснова росту эканомікі — вольнае прадпрымальніцтва і таму падобнае.

У першую дзясятку рэйтынгу дзяржаў, дзе жыць лепш за ўсё, увайшлі: Аўстралія, Аўстрыя, Фінляндыя, Германія, Сінгапур, ЗША, Швейцарыя, Ганконг (фармальна — адмысловы адміністрацыйны раён Кітая), Данія і Новая Зеландыя. На апошнім, 104-м месцы, апынуўся Емен.

У постсавецкіх дзяржавах найбольш прыемнае жыццё ў жыхароў Эстоніі, якая заняла 36-е месца, падзяліўшы яго з Уругваем. Латвія на 41-м месцы (разам з Венгрыяй), Казахстан — на 56-м, Расія — на 57-м, Украіна — на 68-м (разам з Македоніяй), Узбекістан — на 80-м (разам з В'етнамам), Малдова — на 83-м (разам з Гандурасам).

Для параўнання, Францыя і Вялікабрытанія — на 14-м месцы, Ізраіль — на 20-м, Італія — на 25-м, Кувейт — на 30-м, Тайланд — на 35-м, Бразілія — на 43-м, Саудаўская Аравія — на 45-м, Кітай — на 54-м, Венесуэла — на 58-м, Турцыя — на 61-м, Індыя — на 70-м.

# ЗА ТЫХ, ХТО Ў МОРЫ!

Ёсць нагода

**19 лютага адзначаецца Сусветны дзень кітоў. Заснаваны ён быў у 1986 годзе, калі Міжнародная кітовая камісія спыніла больш як 200-гадовае бязлітаснае вынішчэнне гэтых марскіх млекакормячых і ўвяла забарону на камерцыйны кітовы промысел.**



Права на паляванне было захаванае толькі для некаторых карэнных народнасцяў — абарыгенаў Чукоткі, Аляскі, Грэнландыі і карыбскай краіны Сент-Венсінт і Грэнадзіна, для якіх гэты промысел з'яўляецца «традыцыйнай асновай жыццядзейнасці», і для навукоўцаў — у даследчых мэтах. Ды й тым кітовая камісія штогод выдзяляе пэўны ліміт здабычы. Мараторый дзейнічае і цяпер — паляванне на кітоў і гандаль іх мясам ва ўсім свеце забаронены. Праўда, з яго па ўласнай волі выйшлі Нарвегія (у 1993 годзе) і Ісландыя (у 2006), дзе камерцыйная здабыча кітоў вядзецца.

Дарэчы, гэты дзень лічыцца днём абароны не толькі кітоў, але ўвогуле ўсіх марскіх млекакормячых. Часта эколагі аб'ядноўваюцца і прысвячаюць дзень аднаму канкрэтнаму ўнікальнаму іх віду, якому пагражае небяспека знікнення.

Напрыклад, у 2007 годзе група навукоўцаў абвясціла аб магчымым знікненні з твару зямлі кітайскага азёрнага дэльфіна. Калі хоць адзін экзэмпляр не будзе знойдзены ў найбліжэйшыя гады, Сусветны саюз аховы прыроды прызнае гэты від вымерлым — прычым, у выніку дзейнасці чалавека... Таму абарона патрэбна ўсім ім — ад сіняга кіта, самага вялікага млекакормячага на планеце, да самага рэдкага насельніка мораў — міжземнаморскага цюленя-манаха.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже недвижимого имущественного комплекса – оздоровительного лагеря «Теремок», расположенного по адресу: Брестский район, Тельминский с/с, д. Щебрин.**

Брестский областной союз потребительских обществ (Продавец) совместно с ЧУП «Белкоопроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – оздоровительного лагеря «Теремок», расположенного по адресу: Брестский район, Тельминский с/с, д. Щебрин.

Начальная цена снижена на 50 % и составляет 1 140 000 000 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 1 % от начальной цены, сумма задатка 11 400 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 7/09 от 09.02.2009 г., без НДС»).

Аукцион состоится **02.03.2009 года** в 13.00 по адресу: г. Брест, ул. Советская, 25, 2-й этаж, актовый зал.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.02.2009 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей,17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 7/09 от 09.02.2009 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 5-ти банковских дней с даты проведения аукциона.

Подробное извещение опубликовано в газете «Рэспубліка» от 28.06.2008 г. № 119.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Брестского областного союза потребительских обществ к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Переход права пользования земельным участком будет осуществлен в соответствии с действующим законодательством РБ.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

**Контактные телефоны: (8017) 226 78 84, 226 94 83, (8029) 720 56 49, (8029) 623 17 58.**



**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

# ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимого имущества:**

| № лота | Объект | Общая площадь (кв.м) | Адрес | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное строительством законсервированное капитальное строение, 3-этажная кирпичная пристройка к корпусу № 17 «а» | 1598,4 | г. Молодечно, улица В. Гостинец, 67 | 643 647 060 | 5 % |
| 2 | Площадка для сбора мусора | 94,20 | | 5 137 830 | 10 % |
| 3 | Теплопункт, (корпус № 11) | 101 | | 19 607 670 | 10 % |
| 4 | Ремстройцех и столярная мастерская (корпус № 12) | 431,8 | | 63 316 080 | 10 % |
| 5 | Бассейн оборотного водоснабжения | пл. застр. 464 | | 64 437 930 | 10 % |
| 6 | Склад металла заготовительный резной (корпус № 10) | 626,5 | | 95 126 400 | 10 % |
| 7 | **1)** Корпус 16 Б, АСУП *(1216,1 кв.м)*; **2)** прессовый участок пластмасс, (пристройка к корпусу № 16 Б), *199,1 кв.м*; **3)** пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *422,1 кв.м*; **4)** склад готовой продукции (корпус 16 Б), *397,1 кв.м*; **5)** два металлических навеса для хранения тары при корпусе 16 Б *(142 кв.м, 119 кв.м.)*; **6)** пристройка к складу готовой продукции к корпусу 16 Б, *298,2 кв.м.* г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | | | 543 024 000 | 5% |
| 8 | Здание столовой (3-этажное, с подвальным помещением и помещением трансформаторной подстанции; в т.ч. оборудование — трансформатор ТМ 400/10/04; ТРП | 5378,2 | г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 1 753 449 525 | 50 000 000 |
| 9 | Одноэтажное кирпичное здание (состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, кран-балки) | 851,1 | г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5 | 349 178 850 | 10 % |
| 10 | Административное здание (2-этажное кирпичное) | 474,9 | | 418 047 480 | 10 % |
| 11 | Бокс гаражный | 92,8 | | 37 120 680 | 10 % |
| 12 | Шиферный склад | 130,4 | | 48 987 180 | 10 % |
| 13 | Здание участка литья пластмасс | 187,4 | г. Молодечно, ул. Замковая, 19 | 97 972 200 | 10 % |
| 14 | Административный корпус (2-этажный кирпичный) | 576,1 | г. Молодечно, ул. Нагорная, 5 | 383 867 164 | 10 % |
| 15 | Одноэтажное кирпичное здание конторы | 135 | г. Молодечно, ул. Чарота, 16 | 83 348 501 | 10 % |
| 16 | Изолированное производственное помещение малярного участка | 352,3 | г. Молодечно, ул. Промышленная, 4. | 76 104 000 | 10 % |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.01.2009 г. Аукцион состоится **24 марта 2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23 марта 2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел: (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*



***Объявление, вышедшее в газете «Звязда» № 29 (26387) от 17 февраля 2009 г., считать недействительным.***

## Открытое акционерное общество ОАО «Торговый центр «Уручье»

проводит отчетно-выборное собрание акционеров 21.03.2009 г. в 13.00 в магазине по адресу: г. Минск, ул. Руссиянова, 36.

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-экономической деятельности за 2008 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии.
3. Утверждение годового отчета, распределение прибыли, утверждение годового баланса.
4. Выборы Наблюдательного совета.
5. Выборы Ревизионной комиссии.
6. Об аннулировании акций, выкупленных на баланс Общества.
7. Об увеличении номинальной стоимости акций и уставного фонда за счет собственных источников.
8. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.
9. О проведении закрытой подписки на акции.
10. О выкупе акций Общества на баланс Общества.

Регистрация участников собрания 21.03.2009 г. с 12.30 до 13.00 с предъявлением паспорта или доверенности на право участия и голосования на собрании.

УНН 101081643. **Наблюдательный совет.**

